Як аргумэнтам у сваю абарону беларускія ўлады могуць выкарыстаць статыстыку Міжнароднага інстытуту мэнэджмэнту ў Лазане. Тамтэйшыя навукоўцы падлічылі, што якасьць існаваньня беларусаў у 1,1 раза пераўзыходзіць умоўны сусьветны ўзровень. Але гэты паказальнік губляе сваю эфэктнасьць, калі ўлічваць, што немцы жывуць ў 8,2 разы якасьней, чым агулам у сьвеце, а ў аўстрыякаў гэтая лічба дасягае ледзь не дзевяткі.

Аўтары аанаўскае справаздачы прыйшлі да высновы, што высокі, па мерках бальшыні беларусаў, узровень жыцьця пры канцы савецкага пэрыяду выклікае ў іх настальгію аб мінулым і змушае адмовіцца ад якой-кольвек уласнай вызначанасьці наконт сваёй будучыні.

Па выніках сацыялягічных дасьледаваньняў НАН Беларусі, на якія спасылаецца ў сваім артыкуле Анатоль Багдановіч, колькасьць прыхільнікаў хуткага пераходу да рынкавае эканомікі з 1990 году паменшылася ўдвая. Больш як 40 адсоткаў беларусаў хацелі б, каб эканоміка разьвівалася па сацыялістычных прынцыпах. Багдановіч упэўнены, што *«грмадзяне Беларусі не ставяць знака роўнасьці паміж рынкам і капіталізмам... Адпаведна, сапраўдныя мэты тых пераўтварэньняў, што цяпер ажыцьцяўляюцца, шмат для каго зь іх незразумелыя. Гэта сьведчыць і аб нежаданьні насельніцтва адмовіцца ад сацыяльных гарантыяў мінулага грамадзкага ладу ды сацыялістычных каштоўнасьцяў»*.

У аснове прынятае ў краіне сацыяльнае мадэлі знаходзіцца канцэпцыя аб бясспрэчным праве дзяржавы кантраляваць грамадзкія працэсы. Такое думкі трымаецца Валеры Карбалевіч. Настырчаныя дзяржаўныя вушкі ўспрымаюць нават нязначную аўтаномію ад уладаў, спробу адасобіцца ад дзяржаўнага кіраваньня (як у выпадку з прадпрымальнікамі) з асьцярогай. *«Дзяржава бачыць у іх канкурэнтаў у вырашэньні грамадзкіх праблем»*.

Разам з гэтым, назіраецца крызіс даверу насельнікаў Беларусі асноўным інстытутам грамадзтва й дзяржавы. Па выніках сацыялягічнага апытаньня, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльных, эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, толькі 14 адсоткаў людзей, у якіх пазычылі грошы і не вяртаюць іх, зьвернуцца па дапамогу ў міліцыю, амаль столькі ж – да знаёмых з сувязямі. У суд пойдуць трошку больш як 10 адсоткаў насельніцтва. Бальшыня ж будзе разьлічваць на свае ўласныя сілы.

Недавер да дзяржаўных структур ёсьць перадумовай прававога нігілізму, які асабліва яскрава выяўляецца ў моладзевым асяродку. Кожнае восьмае злачынства зьдзяйсьняецца пацанёнкам ці дзяўчынкай, што яшчэ не мае права набываць гарэлку ў краіме. Адсюль і нязьменнае трэцяе месца ў сьвеце па колькасьці зьняволеных на сотню тысяч насельніцтва, нягледзячы на сацыяльны мір і стабільнасьць, а таксама на частыя амністыі.

Але найбольш востра паўстае ў Беларусі дэмаграфічны крызыс. Агульная колькасьць насельнікаў у краіне скарачаецца ва ўмовах павелічэньня арміі пэнсыянэраў. Асноўная маса людзей у Беларусі памірае не ад старасьці, а ад хвароб, няшчасных здарэньняў ды траўм. Кожны пяты беларус не дажывае да заслужанага адпачынку, кожны пятнаццаты недацягнуўшы да пэнсіі накіроўваецца да продкаў у выніку атручаньня алькаголем.

Стваральнікі справаздачы ўпэўненыя, што асэнсаваньне жудаснае рэчаіснасьці ёсьць надзвычай важным крокам у слушным накірунку. Застаецца толькі высьветліць, рух у якім кірунку ўсё ж слушны. Адзін з аўтараў справаздачы, Віктар Пінігін, лічыць, што краіна нібы застыла й ня ведае, куды цяпер падацца. *«Магчымасьці цяперашняе сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня... вычарпаныя»*.

■

МІНУЛАЕ

СТВАРЭННЕ ГЕРБА БЕЛАРУСІ

геральдычныя гульні мажных дзядькаў-ідэолагаў

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

Пасля дзяржаўнага перавароту ў кастрычніку 1917 года беларуская геральдыка ў самым прамым сэнсе гэтага слова была непрымальна для новай савецкай улады. Савецкая сімволіка на працягу ўсяго панавання камуністычнай партыі стала своеасаблівай формай прапаганды «*неўміручых ідэй*» казарменнага сацыялізму.

Савецкая сістэма ўлады была жорстка цэнтралізаванай, аўтарытарнай, з шырокім выкарыстаннем дыктатарскіх метадаў. Сваё найбольш поўнае адлюстраванне гэта тэндэнцыя атрымала ў 1930-ыя гады. Савецкі грамадскі лад пачаў грунтавацца на манапольным становішчы дзяржавы і яе камуністычнай партыі.

Пад усчувальным уздзеяннем савецкай сімволікі фарміравалася афіцыйная геральдыка новых савецкіх рэспублік. Ва ўсіх іх гербах ярка адлюстраваліся мэты і таталітарна-класавы характар камуністычнага праўлення: аднолькава строгае паўтарэнне кругавой канструкцыі выявы герба, абкружэнне яго рознымі збажовымі каласамі, кветкамі канюшыны і г. д., ужыванне іншых элементаў савецкай геральдыкі.

Трэці раздзел апошняй главы Канстытуцыі ССРБ, першай канстытуцыі савецкай Беларусі, прынятай 3-га лютага 1919 года І Усебеларускім з'ездам саветаў, створанай, дарэчы, на ўзор канстытуцыі РСФСР 1918 года, быў прысвечаны дзяржаўнаму гербу і сцягу ССРБ.

Першы герб Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі амаль нічым не адрозніваўся ад герба РСФСР, акрамя надпісаў. Але не гэта было галоўнае. У Маскве ні Украіна, ні Беларусь, ні іншыя будучыя саюзныя рэспублікі не разглядаліся як самастойныя прававыя ўтварэнні, якімі б дэмагагічнымі разважаннямі яны не прыкрываліся. Далейшыя патрабаванні палітычнай кан'юктуры і нахабнае імкненне ўтрымаць у сваіх жалезных абдымках як мага большую тэрыторыю прывялі да стварэння 20 лютага 1919 года Літоўска-Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі (ЛітБел). Цікава адзначыць, што ва ўрадзе гэтай рэспублікі не было ніводнага беларуса. Вось табе і нацыянальная дзяржава!

28 лютага 1919 года Рада народных камісараў зацвердзіла афіцыйную назву рэспублікі – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі. Быў зацверджаны і дзяржаўны герб ЛітБел. У чырвоным полі залатыя серп і молат, размешчаныя крыж-накрыж ручкамі ўніз і абкружаныя вянком з каласоў, абвітых чырвонаю стужкаю з надпісам «Пралетарыіі ўсіх краін, яднайцеся!» і афіцыйнай назвай рэспублікі на літоўскай, беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Трэба нагадаць, што да цяперашняга часу не знойдзена ні адной выявы гэтага герба. Хутчэй за ўсё, акрамя апісання выявы, герба не існавала. Дзяржаўны сцяг ЛітБела ўяўляў сабою палотнішча чырвонага колеру. 31 ліпеня 1920 года ЛітБел ССР юрыдычна спыніла сваё існаванне, калі была прынята дэкларацыя аб абвяшчэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь на сумесным пасяджэнні мінскага губернскага ВРК з шэрагам палітычных партый і прафсаюзных арганізацый Мінскай губерні. Прыняцце дэкларацыіі было абумоўлена вызваленнем Беларусі ад польскіх акупантаў і фактычным скасаваннем ЛітБела. Дэкларацыя, дарэчы, не акрэслівала межы Беларусі. «*Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь*, – гаварылася ў ёй, – *вызначае сваю заходнюю мяжу на этнаграфічнай мяжы паміж Беларуссю і буржуазнымі дзяржавамі, якія прымыкаюць да яе*».

Утварэнне СССР дало адчувальны штуршок для пошукаў новага герба Беларусі, які б мог нейкім чынам адлюстраваць дзве несумяшчальныя ідэі: адзінства ўсёй краіны СССР, адметныя рысы рэспублік, і, разам з тым, не з'яўляўся б дакладнай копіяй герба СССР. Як бачым, задача па стварэнню герба БССР была даволі нялёгкай.

У канцы лютага 1924 года прэзідыум ЦВК БССР аб'явіў конкурс па стварэнню герба рэспублікі. За лепшыя варыянты герба Беларусі былі ўстаноўлены тры першыя прэміі на агульную суму 300 рублёў. Але ў сувязі з тым, што тэрміны конкурса былі вельмі сціслыя – да 5-га сакавіка 1924, – конкурс станоўчых вынікаў не даў, што прымусіла арганізатараў прадоўжыць яго тэрмін да 1 мая. Але, нягледзячы на працяг конкурса, ён станоўчых вынікаў не даў.

Адзін з варыянтаў, прадстаўленых на конкурс (аўтар – мастак Г. Змудзінскі), зацверджаны прэзідыумам ЦВК БССР 25 снежня 1924 года ў якасці Ордэна працоўнага чырвонага сцяга БССР – вышэйшай узнагароды ўрада БССР у 1927-1933 гадах. Выява ордэна ў выглядзе трохвугольнага шчыта, пакрытага чырвонай эмаллю, на якім справа – каласы, злева – чырвоны сцяг, у цэнтры – зубчастае кола, а на ім зорка з надпісам: «СССО», серп і сякера; уверсе надпісы «Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!» на беларускай мове, «БССР» на польскай і яўрэйскай мовах, унізе «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка» на беларускай мове. Паводле пастановы прэзідыума ЦВК СССР ад 24 красавіка 1933 года, узнагарода ордэнамі саюзных рэспублік, у тым ліку і ў БССР, спынена ў сувязі з увядзеннем адзінай агульнасаюзнай сістэмы ўзнагарод.

Паралельна з конкурсам ЦВК БССР Рада камісараў даручыла Інбелкульту распрацаваць герб Беларусі. У Інстытуце беларускай культуры была створана камісія, у якую ўвайшлі вядомыя беларускія вучоныя Я. Дыла, В. Дружчыц, В. Мялешка, М. Шчакаціхін і інш. Камісіі Інбелкульта даручалася распрацоўка асноўных палажэнняў аб дзяржаўным гербе. Крыху пазней да работы над стварэннем герба БССР быў падключаны наркамат асветы. На конкурс было прадстаўлена звыш 130 варыянтаў герба.

Найлепшым быў прызнаны варыянт герба БССР беларускага жывапісца, выкладчыка Віцебскага мастацкага тэхнікума В. Волкава (1881-1964). Як рысавальшчык Волкаў валодаў тонкім уменнем выкарыстоўваць фактурныя магчымасці алоўкавага штрыха, стрыманасцю каляровай гамы, дакладнасцю дэталей і таму перамог на конкурсе. Яго малюнак герба, адзначалася ў пастанове Рады камісараў, *«найбольш адпавядаў умовам конкурсу і быў прыняты з некаторымі ўдакладненнямі»*.

Удакладненні тычыліся замены бела-чырвона-белай стужкі (колер дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у 1991-1995 гадах) на суцэльную чырвоную. Варыянт Волкава быў зацверджаны ў якасці дзяржаўнага герба БССР на VIII Усебеларускім з'ездзе саветаў 11 красавіка 1927 года. У прамове першага сакратара ЦК КПБ А. Крыніцкага на гэтым з'ездзе адзначалася, што дзяржаўны герб БССР мае *«характар шрыфту беларускай мовы часткова ў стылі Скарыны»*.

➲ *Заканчэнне на стар. 6*

РЕГИОНЫ

Борисовская символика

Иван КАТАВАСОВ

Новогодние и рождественские праздники добавили немало беспокойства градоначальству Борисова.

Тамошние праздничные хлопоты очень органично дополнились проблемой коммунально-политического благоустройства города.

По примеру президента Лукашенко борисовские демократы тоже постарались политизировать наступление нового века и тысячелетия. В новогоднюю ночь они украсили свой город национальными флагами патриотической бело-красно-белой расцветки.

Утром 2 января 2001 года в центре Борисова появилась забавная достопримечательность. У здания райисполкома на стенде с физиономиями передовиков сельхозпроизводства на месте раскрашенного деревянного президентского герба торчала лишь обгоревшая колода. С грехом пополам 4 января городские коммунальщики это безобразие убрали.

Всю рождественскую неделю в Борисове появлялись все новые и новые политические граффити. Их усердно замазывали коммунальные службы города. Среди обычного набора лозунгов встречалось: «Пераменаў 2001!». По всей видимости, это отметились авторы политического благоустройства города. Как известно, «Пераменаў!» называется объединение нескольких молодежных оппозиционных организаций. Теперь такое обозначилось и в Борисове.

РЕЦЕНЗИЯ

Дайджест белорусский. Социологический

Алексей МАКОВЕЦ

В Минске издана книга Олега Манаева «Становление гражданского общества в независимой Беларуси. Социологические опыты: 1991 — 2000».

«Опыты» Олега Манаева – это собрание статей, данных соцопросов НИСЭПИ, таблиц и комментариев. Публикации разных лет, скомпонованные в четыре главы. «Гражданское строительство», «Власть и оппозиция», «Масс-медиа», «Фабрики мысли». Вместо заключения предлагается «Резонанс» – подборка статей из белорусских газет, посвященных деятельности Манаева и НИСЭПИ.

Искатели белорусских идей, заполучив сей фолиант, вероятно, разочаруются. Книга Олега Манаева – не учебник и не монография «Как нам обустроить Беларусь». Это скорее белорусский социологически-публицистический дайджест, антология статей и данных соцопросов.

Обобщение социологических результатов за разные годы позволяет проследить историю белорусских заблуждений посткоммунистической эры. Тематически отсортированные публикации за десятилетие в сумме создают ретроспективу белорусской социальности после 1990. По «Опытам» можно отслеживать динамику белорусского постсоветского сознания. Социологи, политологи, культурологи и просто интересующиеся получили социологический справочник по новейшему белорусскому менталитету. Интеллектуальной работы по осмыслению белорусской социокультурной специфики у нас все еще непочатый край.



➲ Окончание на стр. 6

ГЕЙ, СЛАВЯНЕ

Интеграционный облом

➲ Окончание. Начало на стр. 1

Он может и поторговаться, и пошантажировать Лукашенко.

В случае с соглашением о введении союзной валюты и выделении кредитов Беларуси на поддержание курса белорусского зайчика россияне потребовали за вобщем-то мизерный кредит предоплату. За мизерную первую траншу (всего 30 миллионов долларов!) – право российскому капиталу на фактически эксклюзивное участие в приватизации пока еще рентабельной белорусской промышленности.

Не спешит Путин и с политической поддержкой белорусского президента. Нигде лично не поддержал палатные выборы, явно не спешит и с назначением Лукашенко кремлевским кандидатом на президентских выборах.

Путин чувствует, что он в более выигрышном положении и может, выдержав паузу, добиться еще каких-либо важных уступок. Поэтому Лукашенко нервничает. В новогоднем поздравлении он даже самым важным событием прошлого века назвал приобретение Беларусью суверенитета (в программном интервью Козияхто это событие было отодвинуто на второе место после *«победы советского народа над фашизмом»*), а вовсе не успешное движение на пути к *«воссоединению народов»*. Лукашенко даже пообещал крепить суверенитет и никому его не отдавать. Если бы это поздравление смотрел где-нибудь в Польше или Вашингтоне Зенон Станиславович, то мог бы и прослезиться от умиления.

Как это ни парадоксально, Александру Григорьевичу пока можно верить. Он понимает бесперспективность сдачи независимости Беларуси на путинских условиях. Роль президентского представителя в пока не существующем восьмом белорусском федеральном округе совсем не то, о чем грезил Лукашенко.

Как говорил Юлий Цезарь, проезжая мимо варварской деревни, лучше быть первым там, чем вторым в Риме. А ведь нашему-то цезарю даже не предлагают роль второго в так им любимом Третьем Риме.

Резюмируя, приходишь к выводу, что стратегия Лукашенко на гешефт с Россией и политическое покорение Москвы оказалась весьма проигрышной. Он так заигрался, что теперь даже не может шантажировать Путина, как когда-то Ельцина, тем, что зароет томагавк войны с Западом и отроет свой *«западный вектор»*.

После беспрецедентного нарушения Венской конвенции сначала в Дроздах, а потом везде (последний случай – когда Лукашенко принял верительные грамоты у посла Мадагаскара, но не нашел времени для посла США Майкла Козака, ожидающего этой встречи без малого три месяца), ему просто никто не поверит. Ввязавшись в сражение и выиграв несколько позиционных боев, Александр Григорьевич уже войну проиграл. Последний удар, возможно, будет, когда Путин кинет его на президентских выборах.

ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

Заграница нам поможет, или с нами Буш

➲ Окончание. Начало на стр. 1

– Нет. Мнение это – частное мнение журналистов этих изданий. Конфликт на Ближнем Востоке – достаточно сложный и имеет серьезные причины. К сожалению, тщетные усилия посредников указывают, что надо ожидать нового обострения ситуации.

– «Белорусская деловая газета» считает назначение Хвостова на должность главы МИДа зарей прогресса в белорусской дипломатии. Основаниями для этого, с точки зрения БДГ, являются его личные качества – прекрасное владение дипломатическим этикетом и огромный опыт.

– Хвостов не может что либо изменить. Личные качества не могут развернуть курс внешней политики. Да, Хвостов опытный дипломат, но что он может поделать в нынешней ситуации? Все решает Лукашенко.

– Лукашенковская пропаганда страшит обывателей повторением косовского сценария в Беларуси. Каково Ваше отношение к явлению гуманитарной интервенции? Может ли принцип защиты прав человека быть основанием для вмешательства во внутренние дела независимого государства извне?

– Только ООН имеет право санкционировать гуманитарную интервенцию. Что касается гуманитарной интервенции в отношении Беларуси, то в какой-то форме она уже осуществляется. Это касается дипломатического давления, отсутствия контактов. Давления. Да. Но не больше. Ведь, кроме поощрения гражданских свобод, существуют другие интересы, которые тоже учитываются Западом. Например, Германия никогда на это не пойдет, потому что экономическое сотрудничество с Россией для нее приоритетней.

– Произошла смена американской администрации. Новый хозяин Белого дома обещает пересмотреть внешний курс . Не означает ли это возвращение к идеям изоляционизма?

– Корректировка, конечно, будет, но времена изоляционизма прошли. Американцы очень много инвестировали в регион, чтобы так просто уйти. Резкого поворота в американо-белорусских отношениях не будет. Мы добились трехуровневого присутствия: конгресс, правительство, общественные организации. Нам удалось убедить американцев в ценности Беларуси для поддержания стабильности и демократии в регионе.

– В чем суть различий в отношении к Беларуси в Европе и США?

– Главное – они различаются в подходах. Американцы подчас действуют исходя из высоких идеалистических принципов. Евросоюз к Беларуси ближе, поэтому он избегает резких выпадов. У него есть с нами общие границы, исторические традиции, принципы добрососедства. Расхождения неизбежны, но сегодня позиции ЕС и США все больше и больше сходятся.

– Рассуждения о важности Беларуси для Запада кажутся натянутыми, ведь в этом году Польша и Венгрия вводят для белорусов визовый режим.

– В визовом режиме ничего страшного нет. Самое главное – процедура выдачи и цена визы. В Европе мне даже доводилось получать визу по почте. Увы, восточноевропейцам ничего другого не оставалось, поскольку существуют общие требования ЕС. Впрочем, я уверен, что визовый вопрос можно будет решить, но в другом государстве, не в сегодняшнем. ■

ВЫБОР-2001

ПОБЕДА ДЕМОКРАТОВ В ПЕРВОМ ТУРЕ ВОЗМОЖНА

Уже начавшаяся президентская кампания постоянно преподносит сюрпризы. О своем желании бороться за кресло главы государства заявляет все больше и больше претендентов.

На вопросы «Згоды» о некоторых аспектах будущей борьбы отвечает Сергей Альфер, член правления Белорусского центра конституционализма и сравнительно-правовых исследований.

– Когда на заседании КРДС 15 декабря назвали три предполагаемых кандидатуры на предстоящих президентских выборах – Гончарик, Домаш и Чигирь – журналисты вздохнули с облегчением и немного успокоились. Но перед самым Новым годом появилась еще одна кандидатура – генерал Козловский. Как Вы думаете, еще возможны подобные самовыдвижения либо выдвижения от неких демократических сил?

– Я думаю, что вполне вероятны и другие попытки самовыдвижения иных кандидатов, которые претендуют на то, чтобы представлять на президентских выборах демократические силы. Не решен на сегодняшний день также вопрос, кто именно будет выдвигаться от профсоюзов: Гончарик или другой человек. Насколько мне известно, обсуждается и кандидатура Ярошука. Он также имеет сильные позиции и является интересной фигурой.

Не будем скидывать со счетов и ныне оппозиционных властям Сергея Калякина и Зенона Позьняка: кого-то из них мы обязательно увидим на политической арене на предстоящих выборах.

Поэтому можно сказать, что кандидатов в президенты будет несколько, не два, а пять или шесть. Но с моей точки зрения, реально стоит вопрос только о тех, кто будет утвержден КРДС в качестве единого кандидата от демсил Беларуси.

Я думаю, что и самовыдвижение Павла Павловича Козловского, человека, которого я очень уважаю, не приведет к резкому увеличению кандидатов в президенты, их останется трое. Мне кажется, что это напоминание Павла Козловского о себе, о том, что он не последняя фигура здесь и желает активнее участвовать в общем деле. Хотя, возможно, я и ошибаюсь. Как говорится: чужая душа – потемки.

– Это как раз и был мой второй вопрос. Насколько я понимаю, самым сложным моментом в предстоящем определении единого кандидата является поиск взаимоприемлемого для всех потенциальных кандидатов механизма окончательного фокусирования на одном человеке, который в итоге и будет противостоять Лукашенко. Какой сценарий Вам представляется наиболее удачным, оптимальным?

– Тот сценарий, который будет приниматься или который может быть принят, на сегодняшний день не известен. Я не вхожу в круг тех людей, которые занимаются сейчас работой с кандидатами, это не мой блок вопросов, и мне не стоит в него вмешиваться. Но мне кажется, что было бы замечательно, если бы они между собой договорились об определенной общей позиции и о возможном распределении полномочий в этой троице или четверке в случае, если кто-нибудь будет все-таки выдвинут в качестве единого кандидата. Если бы все работали в единой команде, это был бы, конечно, идеальный вариант. В этом случае вероятность победы единого кандидата в первом туре выборов чрезвычайно высока.

Если мы сможем уменьшить фальсификации на предстоящих президентских выборах, то кандидат от демократических сил может получить больше пятидесяти процентов голосов в первом туре.

– Какая именно договоренность возможна между ними? Единый кандидат должен пообещать какие-то посты в случае своей победы или нечто иное? Ведь не так просто отказаться политику от своих личных амбиций. Политик без амбиций – уже не политик.

– Я полностью с вами согласен. Мне сложно судить, как будут договариваться, кто и какие посты будут распределять. Пока это еще шкура не совсем убитого медведя. Но, я думаю, есть ряд ключевых постов, которые заманчивы для любого политика. Это и пост премьер-министра, который при новом демократическом президенте должен быть фигурой не менее ключевой, чем сам президент. Это и другие определяющие посты в государстве.

Пока еще тяжело говорить, как, где и что будет. Но свято место пусто не бывает, и при определенном компромиссе каждый из этих людей может занять определенную государственную должность, которая будет существенным образом влиять на дальнейшее развитие Беларуси. Главное – чтобы договорились.

– Должно ли окончательное согласование фигуры единого кандидата пройти еще до момента официальной регистрации или может состояться и после?

– Этот вопрос связан с технологией проведения избирательной кампании. Он чрезвычайно тонкий, и я на него сейчас просто не смогу ответить, потому что чисто технологические вопросы отрабатываются в процессе проведения избирательной кампании и могут изменяться в соответствии с той ситуацией, которая является выгодной в данный момент для данного кандидата или для данной группы субъектов избирательного процесса.

Если будет выгодно объявить конкретную фигуру в качестве единого кандидата как можно быстрее, и в результате компромисса это получится, она будет объявлена в ближайшее время: через месяц-полтора. Если демсилы будут видеть, что необходимо проводить кампанию под несколькими человек, то будет проводиться кампания под несколькими человек.

Как пример подобного можно привести Югославию, когда Коштуница был признан как единый кандидат непосредственно перед выборами, а остальные либо сняли свои кандидатуры, либо ушли в тень.

– То есть это не ключевой вопрос, а тактический, вопрос электоральной технологии? И ничего страшного не будет, если все произойдет накануне выборов?

– Важно, чтобы народ знал обо всех людях, которые потенциально идут на выборы как альтернатива Лукашенко от демократических сил. И важно, чтобы народ знал, что в итоге на выборах противостоять Лукашенко будет один кандидат, а не три или четыре, и что остальные работают вместе с ним в команде. Это, с моей точки зрения, не будет способствовать расколу в демократическом спектре, а будет играть на нашу победу.

– И последний вопрос. Какое место в этом сценарии отводится также оппозиционным нынешней власти, но не демократическим кандидатам, например от ЛДПБ и ПКБ?

– Важно и то, какое место они себе отводят сами. Скажем, вчера я от заместителя Гайдукевича услышал: «Вы еще не начали, а мы уже закончили работу». Я это понимаю таким образом, что, учитывая рейтинг либерально-демократической партии, вероятно, они действительно уже закончили свою работу.

При всем уважении к лидерам ЛДПБ, думаю, для них будет представлять серьезную проблему даже прохождение этапа сбора ста тысяч достоверных подписей. Если будет желание у властей, учитывая все-таки недостаточно квалифицированные структуры партии, то у них на этом этапе будут большие проблемы.

А что касается коммунистов из партии Сергея Калякина, у них есть высокая вероятность сбора ста тысяч подписей, есть достаточно большое количество организационных структур, которые жестко партийноуправляемы. Главное – чтобы их менеджеры четко отследили подписи, которые могут быть недостоверными.

Для единого кандидата от демсил выдвижение кандидатуры Сергея Калякина или любого другого представителя коммунистов не будет играть существенной роли, поскольку их электорат, скорее всего, не будет поддерживать демократического кандидата, а в случае отсутствия кандидата-коммуниста будет голосовать за Лукашенко.

Общие программные установки Лукашенко и коммунистов достаточно близки, поэтому старшее поколение, которое голосует за коммунистов, не будет голосовать за демократа. А значит, с нашей точки зрения, выдвижение кандидата от коммунистов было бы полезным. Это реально отнимет определенное количество голосов у Александра Лукашенко.

Но поскольку они работают на одном электоральном поле, а рейтинг Лукашенко все-таки выше, то кандидат-коммунист не наберет значительного количества голосов. Получится где-то четыре, максимум пять процентов, как и на выборах 1994 года, когда баллотировался Василий Новиков.

МІНУЛАЕ

Стварэнне герба...

➲ *Пачатак на стар. 4*

Ухвалены герб БССР В. Волкава быў адзначаны грашовай прэміяй у суме 200 рублёў. Акрамя таго, сем лепшых варыянтаў герба БССР, прадстаўленых выкладчыкамі Віцебскага мастацкага тэхнікума, былі прэміраваны па 50 рублёў кожны.

Паводле тагачаснай канстытуцыі БССР *«дзяржаўны герб... складаецца з малюнка ў промнях узыходзячага сонца, сярпа і молата, якія змешчаны крыж-накрыж ручкамі ўніз і абкружаны вянком; гэты вянок складаецца злева з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынаю, а справа з дубовае галінкі і ўнізе паміж абедзвюма палавінкамі вянка знаходзіцца частка зямной кулі (зямнога шара). Абедзве палавіны вянка перавіты чырвонаю стужкаю, па якой змешчаны надпіс на беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай мовах: «Пралетарыі ўсіх краяў, злучайцеся!» і ніжэй абрывіятура: «БССР». Уверсе знаходзіцца пяціканцовая зорка».*

Канстытуцыя БССР 1937 года пакінула без змен герб БССР, але разгорнуты ў той час наступ на нацдэмаў і ўпартае імкненне камуністычных ідэолагаў знівіліраваць ушчэнт нават знешнія адрозненні не магло не паўплываць і на дзяржаўны герб БССР.

З мэтаю далейшай уніфікацыі і нівіліроўкі знешняга выгляду герба БССР былі зроблены адпаведныя заходы. 28 ліпеня 1938 г. на першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дэпутат І. Захараў заявіў, што *«Беларусь з'яўляецца індустрыяльна-калгаснай краінай. У сельскай гаспадарцы пераважаючай большасцю пасеву зернавых і тэхнічных культур – жыта, лён, канюшына. Усё гэта з'яўляецца асноўным багаццем сельскай гаспадаркі, што і павінна быць адлюстравана ў дзяржаўным гербе Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»*. І на гэтай падставе І. Захараў унёс прапанову: *«замяніць вянок з дубовымі лісцямі вянком з жытніх каласоў, пераплеценых клеверам (канюшынай) і льном»*.

На гэтай сесіі было прынята рашэнне: змяніць у дзяржаўным гербе дубовую галінку на вянок з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынаю і льном. Надпісы на гербе былі пакінуты толькі на беларускай і рускай мовах. Канстытуцыя БССР 1937 года зацвердзіла сімвалы беларускай дзяржаўнасці: герб, сцяг, сталіцу БССР – горад Мінск.

Канстытуцыя 1978 года была прынята 14 красавіка 1978 года на нечарговай 9-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР 9-га склікання. Пабудавана яна ў строгай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1977 г., так званай брэжнеўскай канстытуцыяй. У Канстытуцыі БССР у прэамбуле адзначалася, што *«рабочыя і сяляне Беларусі з дапамогаю рускага пралетарыята ўпершыню ў гісторыя здабылі сваю дзяржаўнасць»*; у СССР, у тым ліку і ў БССР, пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства, сфарміравалася новая гістарычная супольнасць – савецкі народ.

Толькі пасля развала СССР была зроблена ўдалая спроба вярнуць гістарычны герб і сцяг як дзяржаўныя сімвалы БССР. Упершыню сімвалы беларускай дзяржаўнасці – герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг былі выкарыстаны 19 кастрычніка 1988 г. пры афармленні залы ў Доме кіно (цяпер касцёл св. Сымона і Алены), дзе быў створаны арганізацыйны камітэт па утварэнню БНФ.

Пытанне аб нацыянальнай сімволіцы – сцягу і гербе РБ – было ўнесена ў парадак дня верaснёўскай сесіі 1991 года Вярхоўнага Савета. Над малюнкам герба працавалі беларускія мастакі У. Крукоўскі і Я. Кулік.

Дзяржаўны герб як сімвал дзяржаўнага сувернітэту РБ устаноўлены законам РБ ад 19 верасня 1991 года. 19 верасня 1991 г. над Домам урада залунаў дзяржаўны бела-чырвона-белы сцяг. А потым з'явіўся і герб.

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь уяўляў сабою шчыт чырвонага колеру з выяваю герба «Пагоня» – узброены коннік у руху. У правай руцэ коннік трымае гарызантальна падняты меч над галавою, у левай – шчыт, на белым полі якога шасціканцовы залаты крыж (давайце ўспомнік крыж Ефрасінні Полацкай). З левага боку ад конніка пахвамянча, з-пад сядла звісае трохканцавая гунька. Выява дзяржаўнага герба РБ была змешчана на разліковых білетах Нацыянальнага банка Беларусі.

Паводле вынікаў рэспубліканскага рэферэндума, праведзенага 14 мая 1995 года, адным з пытанняў якога было ўстанаўленне новых герба і сцяга. Указам прэзідэнта Лукашенкі ад 7 чэрвеня 1995 года зацверджаны новы эталон герба і палажэнне аб ім.

Прэзідэнцкі герб уяўляе сабой зялёны контур краіны у залатых праменнях сонца пад зямным шарам. Зверху контуру знаходзіцца пяціканцовая чырвоная зорка. Герб абрамляе вянок з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева – ільну. Каласы абвіты чырвона-зялёнаю стужкаю (па колеру сучаснага дзяржаўнага сцяга) на якой зроблены надпіс золатам «Рэспубліка Беларусь». Дарэчы, сучасны зялёны колер на гербе і сцягу больш уласцівы для для мусульман, чым для хрысціянскіх краін свету.

Як бачым, у нас зараз герб і сцяг як пры савецкім ладзе. І сумна, і маркотна. Але ўсе спробы ідэолагаў тагачасных СССР і БССР і сучаснай РБ стварыць і замацаваць новыя нацыянальныя гербы ў стылі славутага сацыялістычнага рэалізму аказаліся няўдалымі, бо новыя гербы супярэчаць шматвякавым традыцыям геральдыкі як па сэнсу, так і па стылі выканання. ■

ПАСЛЯ СВЯТА

АЙЧЫННЫЯ ПАШТОЎКІ

Галіна ЖЫГУЛЬ

Скончыліся святы. Але праблема беларускіх паштовак засталася. Па-ранейшаму амаль немагчыма павіншаваць знаёмых і сваякоў чым-небудзь беларускім.

Гэта ж так натуральна – ганарыцца сваім! Але са сваім, нацыянальным, у беларусаў заўсёды праблемы. За дзевяць гадоў уласнай незалежнасці дзяржава так і не змагла абзавесціся прыстойнымі паштовымі візітоўкамі, што прэзентуюць краіну, наладзіць іх масавы выпуск. Асобныя прадпрымальныя людзі спрабавалі неяк выправіць сітуацыю ўласнымі намаганнямі. Мастак Уладзімір Шаркоў, напрыклад, ужо гадоў пяць займаецца гэтым непрыбытковым для сябе бізнесам. Непрыбытковым таму, што тыя невялікія тыражы, якія ён друкуе за свой кошт, не акупаюцца, а плаціць даводзіцца вялікія падаткі. Так што гэта ў яго хутчэй хобі, а не бізнес.

Сюжэты некаторых мініяцюр ён малюе на кавалачках тканіны, якія становяцца элементам паштоўкі, сюжэты іншых – гэта ілюстрацыі яго ўласных жывапісных работ. Часцей за ўсё яго паштоўкі – рукатворная, філігранная праца. Дарэчы, у сувязі з тым, што Уладзімір выкарыстоўвае на паштоўках сюжэты сваіх уласных твораў, у яго ўзнікалі праблемы з чыноўнікамі ад культуры. Маўляў, на рэкламу сваіх уласных твораў патрэбная ліцэнзія. Давялося нават судзіцца з адной фірмай, што ўзяла ягоны сюжэт і стала тыражыраваць прадукцыю без указання аўтарства і, адпаведна, ганарара.

«Калі я зрабіў першую паштоўку, – расказвае Уладзімір Шаркоў, – *пайшоў з ёй па сталічных выдавецтвах, каб даведацца, хто можа выдаць тыраж. Паўсюль мне казалі, што гэта не іх профіль, ды і не мэтазгодна ім такой драбязой займацца. Але я ведаў іншае: людзям вельмі патрэбная паштоўка з мясцовым каларытам, беларускай нацыянальнай сімволікай, сюжэтамі і вобразамі беларускага жыцця. Працую самастойна, многа эксперыментую. Малюнак паштоўкі выконваю ў розных тэхніках. Рабіў літаграфіі ў выглядзе мініяцюрных эстампаў, пісаў гуашшу па тканіне, змешваў розныя тэхнікі...»*

Максімальны тыраж, што зрабіў мастак Шаркоў, – 10 тысяч экземпляраў. За год-паўтара, як ён кажа, тыраж разыходзіцца. Асабліва высокі попыт на такія паштоўкі бывае пад Новы год. Сёлета ягоныя мініяцюры таксама вельмі хутка былі раскупленыя.

На сталічным паштамце ў мінулым годзе, як гэта ні дзіўна, паштовак было поўна. Аднак не сваіх, беларускіх. Затое можна выбраць еўрапаштоўку з усімі атрыбутамі за нямалы кошт, многа расійскай прадукцыі з елкамі, тройкамі лашадзей і свечкамі. З беларускім жа тэкстам аказалася ўсяго дзве, даволі сціплыя.

Як паведаміў начальнік аддзела выдання знакаў паштовай аплаты прадпрыемства «Белпошта» пры Міністэрстве сувязі Анатоль Сянько, сёлета ў Беларусі былі выпушчаны дзве новыя маркі з навагоднімі і калняднымі сюжэтамі. На адной паказаны старажытны Нясвіж, на другой – Віцебскі гарадскі пейзаж і батлейка. А вось з паштоўкамі заўсёды ёсць праблема. Аказваецца, выдаюць іх, акрамя «Белпошты», толькі дзве фірмы – «Транскэпітэл» і «Паліфакт». «Белпошта» па сутнасці падмяняе, як лічыць Анатоль Сянько, іншыя арганізацыі, якія павінны былі б займацца выданнем паштовак. У першую чаргу гэта Дзяржкамдрук, які мае адпаведную паліграфічную базу. А тая база, што маецца ў «Белпошты», даўно маральна састарэла. Вось таму пакупнік і не мае сваіх, беларускіх, паштовак. ■

ВЫСТАВКА

Магия стекла

Николай РЕЧИЦКИЙ

Выставка стекла в Троицком предместье неожиданно удивляет полнотой охвата исторической и современной тематики. Через мастерство художников стекла от XI века до наших дней можно увидеть эволюцию всего белорусского искусства.

На выставке представлено как мастерство стеклоделов Полоцкого княжества и Речи Посполитой, так и современных художников, заслуженных мастеров и молодых выпускников Академии художеств.

Первые отечественные мастерские по производству стеклянных украшений и посуды появились ещё в XI–XIII веках, во времена Полоцкого княжества. Тогда техника обработки стекла лишь делала первые шаги. Однако украшения и утварь даже из неочищенного зеленоватого стекла греют внутренней теплотой. Древние художники постарались вложить в них душу.




Фото автора

С расцветом так называемой гутной техники качество изделий улучшалось. Во времена Речи Посполитой продукция отечественных мастерских славилась далеко за пределами страны. Производство стекла на Налибокской мануфактуре, мануфактурах графа Тизенгауза и князей Радзивиллов было организовано на самом высшем уровне: на рецептурах богемского стекла.

Впрочем, графу Тизенгаузу, знаменитому великопольскому подскарбию, в этом смысле повезло меньше. Его мануфактура открылась в 1770 году, аккурат накануне первого раздела Речи Посполитой. Через пару лет шляхте стало не до роскоши.

Но дело графа Тизенгауза живет и поныне. В XX веке именно завод *«Нёман»* стал одним из флагманов белорусского стеклоделия. В Гродно и Борисове работают лучшие художники и мастера-стеклоделы.

На выставке можно увидеть и все разнообразие стилей XX века. От работ в стилистике конструктивизма и функционализма до художественных произведений Мурахвера и Мягковой – ведущих мастеров стекла середины века. В современных залах можно найти произведения на любой вкус: лирические, абстрактные, постмодернистские... Есть здесь и работы молодых ребят-дипломников Академии художеств. И, судя по ним, через сто лет выставку будет чем дополнить. ■

ТЭАТР

Сон пра Барбару

Таццяна ПАЛЯКОВА

Напярэдадні Новага года у Купалаўскім тэатры адбылася прэм'ера п'есы Аляксея Дударава «Чорная панна Нясвіжа».

Паставіў новы твор славутага драматурга пра каханне літвінкі Барбары Радзівіл і польскага караля Жыгімонта Аўгуста лаўрэат дзяржаўнай прэміі і мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Раеўскі. Сцэнаграфія – таксама лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Барыса Герлавана. Харэограф Марына Дударава паставіла ўсе танцы і пластычныя эцюды, якія арганічна ўваходзяць у жывую тканіну спектакля. Кампазітар Віктар Капыцько ўдала выкарыстаў інструментальную музыку эпохі Адраджэння ў выкананні ансамбля салістаў «Класік-Авангард» і капэлы хлопчыкаў пры Беларускай акадэміі музыкі.

У спектаклі заняты і прыгожая моладзь, і вядучыя акцёры тэатра. На прэм'еры ў ролі Барбары Радзівіл – Святлана Зелянкоўская, у ролі Жыгімонта – Аляксандр Малчанаў. Браты Радзівілы – Георгій Маляўскі і Ігар Дзянісаў – у іншы дзень, іх сыграюць Аляксандр Лабуш і Аляксандр Гарцуеў. У ролі каралевы, маткі Жыгімонта, італьянкі Боны Сфорца цудоўна выступіла Лілія Давідовіч, другая выканаўца – таксама вельмі цікавая артыстка Тамара Пузіноўская. У ролі інтрыгана пана Мнішка, які па загаду Боны падсоўвае Барбары атруту, я ўбачыла Мікалая Кірычэнку – акцера вялікіх і, здаецца, яшчэ не дастаткова скарыстаных магчымасцей. Мяркую, што цікава сыграе ролю і другі выканаўца – Алег Гарбуз.

Спектакль пачынаецца сімвалічным пахаваннем каралевы Барбары. Малады кароль Жыгімонт Аўгуст сумуе па жонцы, прыязджае на яе радзіму і аддаецца ўспамінам у алеях Нясвіжскага парку.

Вось анёлы разаслалі па сцэне белае пакрывала, і на ім з'явіліся Барбара і каралевіч Жыгімонт. Каханыя гавораць палкія і пяшчотныя словы, а на іх аднекуль зверху, быццам з нябёсаў, сыплецца нешта падобнае на снег – сімвал чысціні.

Вось Жыгімонт і Барбара ўступаюць у тайны шлюб. Але паміраe стары кароль, Жыгімонта клічуць у Польшчу займаць апусцелы трон.



Каралева Бона даведалася, што сын яе патаемна ў Вільні ўступіў у шлюб. Не, яна не аддасць *«літоўскай сучке»* адзінага сына: *«Перад табой сцяна агню паўстане, альбо сыдзі, альбо цябе не стане!»*.

Па загаду Боны да Барбары едзе каварны пан Мнішак. Быццам знянацку, ён пакідае ў Нясвіжы атруту і атрутную вестку: Жыгімонт паехаў сватацца да іншай.Тое ж самае сцвярджае Барбары і каралева Бона. Барбара ў адчаі п'е атруту.

Актрыса павольна падае на рукі анёлаў, якія падтрымліваюць яе. Не, гэта яшчэ не смерць, атрута падзейнічае праз паўгода. Вось Жыгімонт прыехаў, каб забраць каханую: *«Вы – мая жонка, значыць каралева»*. А яна ведае, што хутка памрэ: *«Я – грэшніца. Даруй мне, мой каханы!»*.

Скончыўся спектакль. Усхваляваныя гледачы ўчыняюць артыстам авацыю. Так, гэта прыгожая, стыльная, трохі пампезная пастаноўка. Сапраўды сон аб каханні, мара аб ідэальных пачуццях, а мы ў глыбіні душы ўсе прагнем ідэалу.

Пахавалі Барбару ў Вільні ў кафедральным саборы на плошчы Гедыміна. Кажуць, на яе труне можна ўбачыць жывыя кветкі. А калі б пахавалі нябожчыцу ў Нясвіжы, ці ўшанавалі б беларусы яе магілу? Хто ведае?

Успамінаю, як ў 30-я гады ламалі адзін з крамлёўскіх сабораў, і труны рускіх царыц выкідвалі ледзь не на сметнік. Затое, як кажуць, у Нясвіжы блукае яе прывід – чорная дама. Прывіды не падуладныя нікому. Нават германцы падчас другой сусветнай вайны, убачыўшы прывід Барбары, уцякалі з крыкам: «Чорная фрау!». Рэчаіснасць заўсёды больш жорсткая за паэтычныя фантазіі, але дрэнна было б жыць без паэтаў. ■

РЕЦЕНЗИЯ

Дайджест белорусский. Социологический

⊂ *Окончание. Начало на стр. 5*

Так что книга Олега Манаева будет хорошим подспорьем подрастающему поколению гуманитариев в анализе белорусской соцреальности.

Несмотря на изрядную долю публицистики, манаевский дайджест – издание, прежде всего, социологическое. Доктор исторических наук Дмитрий Фурман из Института Европы РАН и руководитель группы ОБСЕ в Беларуси Ханс-Георг Вик о том и говорят в своих предисловиях. Социология без партийного ангажемента до сих пор пребывала в немилости что у режима, что у национал-оппозиции. А вот тем, кто желает умом Беларусь понимать, подборка Олега Манаева приходится кстати. Отчеты НИСЭПИ не стыкуются ни с официальной ура-пропагандой, ни с нацонал-оппозиционерским мифом про толерантный, умный белорусский народ. Через социологический анализ этого самого народа предпочтений проясняются многие белорусские парадоксы. Как то: рейтинг президента неуклонно снижается, а гражданский общественный воз – и ныне, где пребывал.

